# Узбагачэнне слоўнікавага запасу навучэнцаў I класа на ўроках беларускай мовы



**Н. У. МУРАШКА,**
магістр, настаўнік пачатковых класаў СШ № 196 г. Мінска

Курс беларускай мовы ў I класе агульнаадукацыйных школ з рускай мовай навучання і выхавання з’яўляецца вусным. Сярод яго дамінуючых задач можна вылучыць наступныя: фарміраванне ўменняў асэнсавана ўспрымаць беларускае маўленне на слых і актыўна карыстацца лексічным багаццем мовы [1].

На кожным уроку вучні I класа знаёмяцца з новымі беларускімі словамі, і часцей за ўсё гэта адбываецца сітуатыўна, калі яны сустракаюцца ў вучэбных тэкстах. Тлумачэнне лексічнага значэння слова не забяспечвае трывалага папаўнення слоўнікавага запасу, таму неабходна мэтанакіраваная і сістэматычная работа, якая магла б гарантаваць загадзя запланаваны вынік.

Знаёмства з новымі словамі ў I класе адбываецца згодна з праграмай і метадычнымі парадамі па схеме, “... некалькі лексічных груп, кожнай з якіх прысвечаны асобны ўрок, аб’ядноўваюцца ў больш буйную групу тэматычнай лексікі” [2, с. 6], з апорай на малюнак.

Акрамя таго, метады і прыёмы работы са словамі павінны адпавядаць раздзелам вуснага курса беларускай мовы (“Вучымся слухаць і вымаўляць”; “Вучымся слухаць і адказваць”; “Вучымся слухаць, чытаць і адказваць”), якія звязаны з пераносам навыку чытання з рускай мовы на беларускую.

Такім чынам, сістэматычная работа з мэтай узбагачэння слоўнікавага запасу павінна адбывацца з апорай на:

- праграмныя патрабаванні;
- малюнак;
- перанос навыку чытання.

Пад словазлучэннем “апора на малюнак” неабходна разумець ілюстраванне вучэбнага матэрыялу, якое дапаўняе вуснае тлумачэнне і ажыццяўляецца непасрэдна падчас урока. Візуальнае суправаджэнне інфармацыі значна павышае ўзровень яе засваення.

У педагогіцы гэта называецца прынцыпам нагляднасці ў навучанні, рэалізацыя якога залежыць ад якасці дыдактычных матэрыялаў і тэхнічных сродкаў, валодання настаўнікам навыкамі іх выкарыстання, створаных у адукацыйных установах умоў для ажыццяўлення вучэбнага працэсу. Усе гэтыя фактары ў сукупнасці даюць магчымасць педагогу творча прымяняць наглядныя сродкі адпаведна з пастаўленай дыдактычнай задачай, асаблівасцямі навучальнага матэрыялу і іншымі канкрэтнымі ўмовамі.

Ілюстраванне вучэбнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы ў I класе можа мець наступныя формы:

- дэманстрацыйны матэрыял — друкаваныя прадметныя ці сюжэтныя малюнкі, плакаты, карткі і інш.;
- размалёўкі;
- прэзентацыі;
- малюнкі, выкананыя навучэнцамі.

Прадэманструем некаторыя метады і прыёмы работы, скіраваныя на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу, з выкарыстаннем розных формаў ілюстравання вучэбнага матэрыялу.

**Паказ.** Паказ прадмета — самы просты спосаб запамінання слова, які часам можа абмяжоўвацца дэманстраваннем *прадметнага* (для назоўніка ці прыметніка) або *сюжэтнага* (для дзеяслова) малюнкаў. Гэты прыём выкарыстоўваецца для тлумачэння слоў з пэўным значэннем.

На ўроках беларускай мовы паказ звычайна ажыццяўляецца з дапамогай самога прадмета ці з’явы і дэманстрацыйнага матэрыялу (плакатаў, малюнкаў, картак; *гл. фота 1*) або з дапамогай мультымедыйнай прэзентацыі, якая дэманструецца на экране манітора, тэлевізара, электроннай дошкі, праектара і г. д.




*Фота 1. Дэманстрацыйны матэрыял па тэме “Я і навакольны свет. Надвор’е, з’явы прыроды”*

**Чароўная скарбонка.** Гэта просты наглядны спосаб назапашвання і выкарыстання на практыцы

слоў. Скарбонка ўяўляе сабой упрыгожаную кардонную скрынку *(фота 2)*, у якую збіраюцца ілюстрацыі з вывучанымі словамі. Для работы са скарбонкай лепш за ўсё падыходзіць такі дэманстрацыйны матэрыял, як карткі ці малюнкі.




*Фота 2. "Чароўная скарбонка"*

*1 этап:* назапашванне слоў. У скарбонку трапляюць словы, якія былі вывучаны на ўроку.

*2 этап:* актыўнае выкарыстанне. Настаўнік ужывае змешчаныя ў скарбонцы словы з мэтай паўтарэння, замацавання, кантролю.

Скарбонка дазваляе педагогу арганізаваць розныя формы работы са словамі на ўроку: франтальную, індывідуальную, парную, групавую. Разгледзім некалькі прыкладаў.

***Франтальная форма работы.***

- **Гульня "Назаві слова".** Настаўнік паказвае прадметныя малюнкі, а вучні разам альбо адзін за адным (па чарзе) называюць слова. Пажадана, каб педагог прадэманстраваў адпаведны набор малюнкаў некалькі разоў запар, павялічваючы тэмп.

***Індывідуальная форма работы.***

- Вучань выходзіць да дошкі, дастае некалькі малюнкаў і называе тое, што на іх намалявана.
- **Гульня "Дапоўні".** Настаўнік пачынае сказ, а вучань дапаўняе яго падыходзячым па сэнсе словам і шукае ў скарбонцы адпаведны малюнак.

*Настаўнік: У лесе збіраюць …*

*Вучань: Суніцы.*

***Парная форма работы.***

- **Гульня "Назаві словы".** Два вучні выходзяць да дошкі, адзін дастае малюнкі са скарбонкі, другі называе, што на іх намалявана. Потым вучні мяняюцца ролямі.
- **Гульня "Знайдзі прадмет".** Першы вучань называе прадметы, малюнкі якіх павінен дастаць са скарбонкі другі вучань.

***Групавая форма работы.***

- Навучэнцы падзяляюцца на тры групы (па радах). Вучні з першай групы дастаюць са скарбонкі па чарзе тры малюнкі, а дзеці з другой групы называюць адпаведныя словы. Пасля малюнкі выцягваюць вучні з другой групы, а дзеці з трэцяй групы адказваюць. Затым вучні з трэцяй групы дастаюць і паказваюць малюнкі дзецям першай групы, а тыя называюць словы. Перамагае група, якая не дапусціла памылак.
- **Гульня "Кракадзіл".** Вучні падзяляюцца на некалькі груп, кожная з якіх атрымлівае шэраг малюнкаў. Потым адна група паказвае свае словы з дапамогай рухаў і жэстаў, а дзве другія — адгадваюць. Кожная група выступае па чарзе. Перамагае тая група, якая дала больш правільных адказаў. *(Трэба адзначыць, што для гэтай гульні падыйдуць толькі тыя словы, якія можна паказаць рухамі ці жэстамі.)*

**Стварэнне тэматычнага асяроддзя** [3]. Яшчэ адзін просты спосаб — гэта размяшчэнне малюнкаў са словамі, якія вывучаюцца, у класе, на ўзроўні вачэй дзяцей *(фота 3)*. Добраму запамінанню слоў спрыяюць якасныя яркія прадметныя ці сюжэтныя малюнкі.



*Фота 3. Тэматычнае асяроддзе*
*"Я і мая школа. Вучэбныя рэчы"*

Паколькі ўрок беларускай мовы ў I класе праводзіцца адзін раз на тыдзень, словы, якія размяшчаюцца на сценах, шафах і г. д., могуць знаходзіцца там да наступнага ўрока.

Стварэнне тэматычнага асяроддзя можна ажыццяўляць і з дапамогай дзіцячых размалёвак з выявамі патрэбных прадметаў, якія настаўнік раздае вучням. Навучэнцы іх самі размалююць, а затым развесяць у класе.

У час работы з размалёўкай важнае значэнне мае подпіс да прадметаў. Пісаць на беларускай мове навучэнцы I класа яшчэ не ўмеюць, а навык чытання паступова пераносіцца з рускай мовы, таму мэтазгодна ў якасці подпісу да малюнка пакідаць контур літар, якія вучні таксама могуць размаляваць. Гэта абумоўлена тым, што, пакуль размалёўваюцца літары, вучні некалькі разоў чытаюць іх (ці толькі знаёмыя літары) і запамінаюць словы.




*Прыклад размалёўкі для работы са словамі*

**Стварэнне тэматычных ілюстрацыйных слоўнікаў** [3]. З дапамогай размалёвак або

дзіцячых малюнкаў можна рабіць тэматычныя ілюстрацыйныя слоўнікі. Яны вельмі зручныя, бо лёгкія ў стварэнні і прымяненні і заўсёды знаходзяцца пад рукамі. Акрамя таго, гэта яшчэ і цікавы творчы працэс, у якім задзейнічаны ўсе навучэнцы.

**Стварэнне калажоў па зададзенай тэме** [3]. Гэта цікавы варыянт вывучэння і замацавання слоў з дапамогай дзіцячых размалёвак.

Настаўнік дзеліць клас на некалькі груп, якім прапаноўваецца тэма калажу і размалёўкі з адпаведнымі прадметамі. Кожны ўдзельнік групы расфарбоўвае свой прадмет і подпіс да яго, а затым выразае іх па контуры. Выява прадмета і подпіс да яго выразаюцца паасобку. Пасля таго як кожны вучань скончыў сваю частку працы, група абмяркоўвае кампазіцыю і стварае калаж. На апошнім этапе навучэнцы размяшчаюць подпіс да кожнага малюнка.

**Выяўленчая дыктоўка.** Творчы спосаб кантролю атрыманых ведаў з дапамогай дзіцячых малюнкаў.

Кожны навучэнец атрымлівае аркуш паперы, які дзеліць на чатыры часткі. Настаўнік называе чатыры словы на пэўную тэму, а дзеці малююць названыя прадметы. Пасля вучні атрымліваюць надрукаваныя назвы прадметаў і прыклейваюць іх да адпаведных малюнкаў. Такім чынам можна назапасіць выдатны выяўленчы слоўнік.

**Малюнкавы тэст.** Гэта яшчэ адзін варыянт кантролю атрыманых ведаў з выкарыстаннем дэманстрацыйнага матэрыялу, які праводзіцца і ў выглядзе гульняў “Знайдзі патрэбны малюнак” ці “Што лішняе?”, і ў выглядзе звычайнага тэста.

- **Гульня “Знайдзі патрэбны малюнак”.** Настаўнік вывешвае на дошцы малюнкі і прысвойвае ім адпаведныя нумары. Потым называе адно слова і просіць вучняў запісаць на невялікім аркушы паперы нумар малюнка, якому слова адпавядае.
- **Гульня “Што лішняе?”** з’яўляецца адваротным варыянтам папярэдняй гульні. Настаўнік вывешвае на дошцы малюнкі і надае ім адпаведныя нумары. Затым ён называе тры словы, якія прадстаўлены на малюнках. Дзецям неабходна запісаць нумар таго малюнка, назва выявы якога не прагучала.

З цягам часу, калі вучні навучацца чытаць словы, тэст можна праводзіць у больш класічнай форме: настаўнік паказвае малюнак і называе тры варыянты адказу, з якіх неабходна выбраць нумар правільнага і запісаць яго.

Малюнкавыя тэсты можна праводзіць як з дапамогай дэманстрацыйнага матэрыялу, так і з дапамогай мультымедыйнай прэзентацыі. Перавага выкарыстання прэзентацыі ў тым, што яна дазваляе:

- рабіць урокі беларускай мовы больш цікавымі, пазнавальнымі, насычанымі, прадуктыўнымі і эмацыянальна багатымі;
- павышаць матывацыю ў дзяцей да вывучэння роднай мовы.




*Фрагмент мультымедыйнай прэзентацыі па тэме “Я і мая школа. Настаўніца і вучні”*

**Прыём “Дапоўні расказ”.** Гэта прыём абагульнення і замацавання вывучанага матэрыялу (лексічных адзінак). Праводзіцца з дапамогай дэманстрацыйнага матэрыялу ці мультымедыйнай прэзентацыі.

*Варыянт 1.* Настаўнік чытае невялікі тэкст, аднак замест тых слоў, якія навучэнцы ўжо ведаюць, паказвае малюнак. Вучні замяняюць малюнак (называюць) адпаведным словам.

*Варыянт 2.* Настаўнік раздае ці паказвае на слайдзе мультымедыйнай прэзентацыі тэкст, у якім некаторыя словы заменены малюнкамі. Навучэнцы вымаўляюць словы і чытаюць тэкст. Такую работу можна праводзіць у парах, групах або індывідуальна.

Такім чынам, выкарыстанне дэманстрацыйнага матэрыялу, дзіцячых размалёвак і малюнкаў, мультымедыйных прэзентацый у сукупнасці з канкрэтнымі метадамі і прыёмамі дае магчымасць зрабіць працэс узбагачэння слоўнікавага запасу больш эфектыўным і камфортным для навучэнцаў.

*УВАГА*

*З мэтай дапамогі настаўнікам у падрыхтоўцы да ўрокаў прапануецца падборка дэманстрацыйнага матэрыялу, размалёвак і мультымедыйных прэзентацый да вучэбнага дапаможніка па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання (аўтары Н. У. Антонава і Г. А. Галяш). Гэтыя матэрыялы будуць размяшчацца ў мультымедыйным дадатку да навукова-метадычнага часопіса “Пачатковая школа” пачынаючы з № 9/2021, па 4 камплекты — да 4 урокаў у кожным нумары (гл. табліцу ў № 8/2021, с. 64).*

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” для I класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання [Электронны рэсурс] / Нац. адукацыйны партал Нац. ін-та адукацыі. — Рэжым доступу : https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2021-2022-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2021-2022/303-uchebnye-predmety-i-iv-klassy-2020-2021/3797-i-klass.html. — Дата доступу : 14.07.2021.
2. Антонава, Н. У. Беларуская мова : план-канспект урокаў : 1 клас / Н. У. Антонава, Г. А. Галяш. — 4-е выд. — Мінск : Аверсэв, 2020. — 138 с.
3. Niebuhr-Siebert, S. Kinder mit Deutsch als Zweitsprache in der Grundschule / S. Niebuhr-Siebert, H. Baake. — Stuttgart : W. Kohlhammer GmbH, 2014. — 326 s.

*Фота і слайды аўтара.*

*У мультымедыйным дадатку — прэзентацыі і дадатковы матэрыял да ўрокаў 1–4 па вучэбным прадмеце “Беларуская мова”.*